ЗАХОДНЕБЕЛАРУСКАЯ ГРАМАДЗКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА *ЗАСНАВАНА Ў 1920 г.*

ПАГОНЯ

№ 2 (102) *13 – 19 студзеня 1995 г.* *Кошт 100 рублёў*

Прэзідэнцкая дзейнасьць на Беларусі - працяг заганнай дзейнасьці дэпутацкай большасьці Вярхоўнага Савета **-ст.2.**

Беларусь у сілу свайго геапалітычнага становішча мусіць быць адкрытай краінай. **- ст. 3.**

Да кліентаў "спадарожніц" прывозяць пад відам "хатніх гаспадыньь" з вёдрамі і шчоткамі. **- ст. 4.**

ПРАГРАМА ТЭЛЕБАЧАНЬНЯ НА ТЫДЗЕНЬ: Менск – Варшава – Масква - Санкт-Пецярбург.

Да Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

ЗВАРОТ

Гарадзенскай абласной і Гарадзенскай гарадзкой рады ТБМ імя Францішка Скарыны

Шаноўны Спадар Прэзідэнт незалежнай Беларусі.

Беларускі народ аказаў Вам давер, аддаўшы поўную і неабмежаваную ўладу над сваёй шматпакутнай Бацькаўшчынай у Вашыя рукі.

Выбіраючы Вас Прэзідэнтам, беларускі народ спадзяваўся, што Вы станеце гарантам спакою, дабрабыту і сацыяльнай справядлівасьці. Але пра які спакой можна казаць, калі Вы, спадар Прэзідэнт, самі распальваеце варожасьць і ствараеце напружанасьць у беларускім грамадзтве. У Беларусі ідзе планамернае выкананьне Закона аб мовах, адраджаецца прыгажэйшая і старажытнейшая славянская мова. Абсалютная большасьць народа ўспрымае гэты працэс як нармальны і заканамерны. У гэты ж час Вы - кіраўнік дзяржавы - грэбуеце дзяржаўнай мовай, дапускаеце публічныя выказваньні супраць беларускай мовы, падбухторваеце ворагаў Беларушчыны на адкрытыя выступленьні. Вы правакуеце нас на такі ж адкрыты адпор, Вы змушаеце нас дзеля абароны мовы iсьці на праявы нецярпімасьці і радыкальныя дзеяньні. Вы самі падрываеце спакой у сваёй краіне.

Вы патураеце спробам замяніць нашую нацыянальную сімволіку, добра ведаючы, што без бою мы яе не аддамо. Вы зноў змушаеце нас на крайнія дзеяньні, Вы зноў парушаеце спакой грамадзтва.

Вы грэбуеце нашай незалежнасьцю, адкрыта заяўляеце аб жаданьні далучыць Беларусь да Расеі. Але Вы выдатна ведаеце, што мы будзем бараніць сваю незалежнасьць, як рабілі гэта нашыя дзяды-прадзеды на працягу стагоддзяў. Вы рыхтуеце грамадзянскую вайну на Беларусі. Вы праводзіце прарасейскую палітыку, разьлічваючы, у выпадку чаго, на расейскія войскі, і не жадаеце разумець, што Вашая палітыка - не палітыка сяброўства з Расеяй, а палітыка Беларуска-Расейскай вайны.

Спадар Прэзідэнт. Мы рашуча патрабуем накіраваць Вашую Прэзідэнцкую ўладу і сілу не на патураньне ворагам Беларусі, а на абарону яе незалежнасьці, яе культуры, яе мовы. Вы прынялі ў свае рукі незалежную краіну і цераз пяць гадоў павінны вярнуць незалежную Рэспубліку Беларусь, а не Паўночна-Заходні край Расеі.

ЗАЯВА ДЗЯРЖАЎНАГА ДЭПАРТАМЕНТУ ЗША

30 сьнежня выконваючая абавязкі прэс-сакратара Дзяржаўнага дэпартаменту ЗША Крысьцін Шэнлі зрабіла наступную заяву:

"Шэраг беларускіх газет зрабіў спробу надрукаваць даклад члена парламента рэспублікі, у якім былі абвінавачаньні у адрас высокапастаўленых асобаў з адміністрацыі прэзідэнта Лукашэнкі. Газеты выйшлі з белымі плямамі на тых месцах, дзе павінен быў знаходзіцца надрукаваны даклад.

Мы з заклапочанасьцю ставімся да любога выпадку цэнзуры ў адносінах да друку. Свабодныя, без кайданаў цэнзуры сродкі масавай інфармацыі зьяўляюцца заснавальным элементам дэмакратыі і праваднікам мірнага грамадзкага разьвіцьця. Праз друк выбаршчыкі знаёмяцца з цякучымі падзеямі і выказваюць сваю думку аб іх.

Мы заклікаем беларускае кіраўніцтва паважаць правы друку на свабоду слова, якое гарантуецца міжнароднымі пагадненьнямі, такімі, як Усеагульная Дэкларацыя правоў чалавека і Хельсінкскія пагадненьні, а таксама Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь.

Мы зьвяртаемся да Беларусі з заклікам прадоўжыць і ўмацаваць тыя крокі, якія былі ўзяты на шляху дэмакратызацыі і эканамічнай рэформы. Свабодна функцыянiруючая прэса ўяўляе сабой важны складаючы элемент гэтага працэсу".

А ФРОНТ І ГРАМАДА СУПРАЦЬ

Пачатак передвыбарчай кампаніі новага складу парламента адзначаны стварэньнем блока палітычных сіл левай арыентацыі. У лагеры правых пытаньні перадвыбарчай каардынацыі знаходзяцца ў стадыі актыўнага дыскутаваньня.

На нарадзе партый правай і нацыянальна-дэмакратычнай арыентацыі, якая адбылася 9 студзеня, з боку Аб'яднана-дэмакратычнай партыі паступіла прапанова аб стварэньні так званага мяккага блока ў гарадах з раённым дзяленьнем. У сельскай жа мясцовасьці пацьверджаны намер правых сіл выставіць адзіных кандыдатаў. Аднак ідэя "мяккага блока" не знайшла падтрымкі ў прадстаўнікоў Беларускага Народнага Фронту і Беларускай Сацыял-Дэмакратычнай Грамады.

Верагоднасьць стварэньня правага блока дастаткова вялікая, аднак, магчыма, што ўдзел у ім прымуць не ўсе партыі. Найбольш рэальным уяўляецца тое, што ў яго не ўвойдзе АДПБ.

ГАНЧАР – ГЕНЕРАЛЬНЫ САКРАТАР

Адстаўны віцэ-прэм'ер В.Ганчар прыступіў да працы на новай пасадзе. Як паведаміў старшыня Эканамічнага суда СНД Л.Дашук, пасада Генеральнага сакратара адносіцца да разраду адміністратыўна-арганізацыйных. Па яго словах, ніхто не рабіў былому віцэ-прэм'еру пратэкцыі, бо ў колах менскіх юрыстаў усе ведаюць, што ў Эканамічным судзе СНД ёсьць ваканьсіі. Аднойчы патэлефанаваў В.Ганчар. Ён пацікавіўся, ці засталіся ваканьсіі і прапанаваў сустрэцца.

НЯЎРЫМСЬЛІВЫ АНТОНЧЫК

9 студзеня дэпутат ВС РБ С.Антончык зьвярнуўся да сваіх калег-парламентарыяў з просьбай яшчэ раз даць яму магчымасьць выступіць на сесіі Вярхоўнага Савета з інфармацыяй пра карупцыю ў прэзідэнцкай каманьдзе.

У інтэрв'ю нашаму карэспандэнту спадар Антончык растлумачыў, што другі выступ (калі парламент пажадае яго выслухаць) будзе працягам даклада, зробленага ім на сесіі 20 сьнежня. Ён зьбіраецца паказаць прычыны ўзьнікненьня карупцыі і шляхі яе выкараненьня, абвясьціць новы сьпіс блізкіх да прэзідэнта асоб, якія "стымулююць карупцыйную сістэму і нават дапамагаюць крымінальным структурам атрымліваць прыбытак".

"Калі ж парламент адмовіцца мяне выслухаць, то я буду выступаць з другім дакладам на буйных сходах працоўных калектываў. Акрамя таго, будзе выпушчана спецыяльная брашура з маім дакладам", - заявіў Сяргей Антончык.

СІМ

«АКА» ЗА ВАЛЮТУ


Гарадзенскі завод карданных валаў наладзіў выпуск малалітражнага легкавіка "Ака".

Гарадзенская малалітражка будзе камплектавацца з запчастак, што пастаўляюцца на завод расейскім канцэрнам "КамАЗ".


Кошт адной легкавушкі сягае 2800 долараў ЗША.

На фотаздымку: першая "Ака" на канвееры.

Фатаграфаваў: У.УЛАДАСЕВІЧ.



У рэдакцыю працягваюць паступаць віншаваньні з нагоды выхаду ў сьвет сотага нумару "Пагоні". Шчыра дзякуем усім, хто сьвяткаваў гэтую падзею разам з намі. Пішыце нам! Заставайцеся разам з намі!



Калектыву газеты «Пагоня»

ШАНОЎНЫЯ СЯБРЫ!

Сардэчна віншуем Вас з юбілейным 100-м выпускам Вашай газеты - адной з першых ластавак вольнай незалежнай прэсы на Беларусі.

Сваёй нястомнай працай Вы штодня набліжаеце час росквіту Бацькаўшчыны, яе люду паспалітага, вяртаеце нашы беларускія традыцыі, гонар і славу.

Няхай жа заўжды над Вамі зьзяюць шчасьлівыя зоркі.

Усё лятуць і лятуць тыя коні,

Срэбнай збруяй далёка зьвіняць.

Старадаўняй літоўскай Пагоні

Не разьбіць, не спыніць, не стрымаць.

З павагай Г.КУНЕВІЧ,
Старшыня Праўленьня Фонда падтрымкі дэмакратычных рэформ імя Л.Сапегі.

Гэты час пабачыў шмат:
Бруд, хлусьню, падман, разврат.
Сьвет утвораны ж лагічна -
Наўсьцяж дыялагічна,
Бачыць кожнае жытло:
Там вось - цемра, тут - сьвятло.
Шлях да сьвету доўгі, цяжкі,
Кожны крок там важны, важкі.
Патрабуе ён ад нас
Мужнасьці ў каторы раз.
Жыць у стане руйнаваньня
Немагчыма і заганна.
Situations разбурэньня
Вымагаюць new стварэньня.
Быць законатворцам - цяжка,
Шматадказна і паважна.
Modern life пераўтварэньні,
Зьявы, рэчышчы, здарэньні
Патрабуюць новых сэнсаў,
Новых творцаў, новых menzau.
Будучыні будаваньню
Неабходны намаганьні.
Набліжаць нармальны час
Неба выбрала ўсіх нас.
Той, хто хоча шчасьця, ладу,
Памятае: "Веды - улада".
Улада мысьленьня, сумленьня,
Інтуіцыі, натхненьня.
Улада новых тэхналогій,
Разуменьня, псіхалогій.
Нашы дзеці - наша вера,
Хай у жыцьцё ўступаюць сьмела,
Хай становяцца крыніцай
Новых ведаў, мужных дзеяў,
Кемлівасьці ў падзеях,
Добра спраўджаных надзеяў.
Той, хто здольны, той, хто можа,
Хто адказна і прыгожа
У будучыню шлях тарыць -
Бог таго і блаславіць.
Зычым усім на Новы Год
Шчасьця, радасьці, прыгод,
Чыннасьці, сяброў, падзеяў,
Розуму, шмат ведаў, дзеяў.

Настаўніцка-вучнёўскі калектыў Гарадзенскай філіі Беларускага гуманітарнага адукацыйна-культурнага цэнтру.

«ХВАЛЯ» ХВАЛЮЕЦЦА

10 студзеня на гарадзенскім ВА "Хваля" адбылася стыхійная забастоўка рабочых. Галоўнае, што паклікала на забастоўку - гэта малы заробак, прастоі, холад у вытворчых цахах. Свае патрабаваньні рабочыя выказалі ў Звароце да адміністрацыі, якая, прыняўшы яго, паабяцала разгледзець і па магчымасьці вырашыць праблемы.

На думку сьлесара інструментальнага цэха Сяргея Р., адміністрацыя наўрад ці выканае патрабаваньні, бо наўзамен таго, каб займацца вырашэньнем праблемаў, бавіцца ў рэформы, а рабочыя з верасьня не атрымлівалі заробку. Заробак выплацілі нядаўна магнітоламі. Пасьля такой выплаты працоўныя засталіся ў даўгу перад касай аб'яднаньня. Да таго ж, у некаторых цахах ужо сёньня сырымі дровамі паляцца печкі-буржуйкі, ад дыму якіх нельга дыхнуць.

(Ул.інф.)



ПАЛІТЫЧНАЯ СЦЭНА

АБ ПАГРОЗЕ БЕЛАРУСІ

Інфармацыя Ценявога (грамадзкага) Кабінета Міністраў Апазіцыі Беларускага Народнага Фронту

Негатыўныя працэсы ў эканоміцы, палітыцы і дзяржаўным будаўніцтве, што выразна актывізаваліся пасьля выбраньня прэзідэнта, ствараюць непасрэдную пагрозу суверэнітэту, існаваньню дзяржавы і дабрабыту насельніцтва Беларусі. Стала відавочным, што, як і раней, улады і новае кіраўніцтва краіны не зьбіраюцца праводзіць неабходныя рынкавыя рэформы, не вядуць дзяржаўнай палітыкі з пазіцыі беларускіх інтарэсаў. Працягваецца разбурэньне вытворчасьці, эканомікі, навукі, культуры, з новай сілай раскручваецца інфляцыя, узровень якой у лістападзе 1994 г. перакрочыў 50% у месяц. Прэзідэнцкая ўлада засьведчыла сваю некампетэнтнасьць і недэмакратычнасьць. Цынічна дэманструецца непавага да Канстытуцыі і законаў, да беларускай мовы і культуры, уводзіцца грубая цэнзура і адміністрацыйнае кіраваньне сродкамі масавай інфармацыі. Шляхамі мэтанакіраванай антыбеларускай кадравай палітыкі і скарачэньнем бюджэтнага фінансаваньня разбураецца беларускае войска. Адначасна ўмацоўваюцца МУС і КДБ, у падпарадкаваньне якіх перадаюцца бояздольныя вайсковыя часткі. Разбураецца і без таго недзеяздольная сістэма выканаўчай улады саветаў шляхамператварэньня яе ў аўтарытарную прэзідэнцкую "вертыкаль", што несумненна прывядзе да яшчэ большага росту карупцыі, беззаконьня і парушэньня правоў людзей. Выразна відаць, як ствараецца адміністрацыйна-паліцэйскі аўтарытарны рэжым дзеля таго, каб потым гарантаваць сваю ўладу незалежна ад вынікаў кіраваньня.

За студзень-лістапад 1994 г. у дачыненьні да студзеня-лістапада 1993 г. цэны ўзрасьлі ў 24,2 раза.

Валавы ўнутраны прадукт за гэты ж перыяд зьменшыўся на 22 працэнты, сярэднемесячны прырост спажывецкіх цэнаў склаў 28,4 працэнта, у тым ліку ў лістападзе 1994 г. у параўнаньні з кастрычнікам гэтага ж года - 40,5 працэнта.

На мяжы эканамічнага краху апынулася сельская гаспадарка. Вытворчасьць зерня зьнізілася да ўзроўню 1984 года, закупкі садавіны і гародніны - да ўзроўню 1975 г. Пагалоўе жывёлы паменшылася ў параўнаньні з 1990 годам на 1 млн. 748 тыс.галоў. У тым ліку кароў - на 321 тыс. галоў, сьвіней - на 1 млн. 82 тыс. галоў. Значна зьнізілася прадукцыйнасьць жывёлы. У выніку забясьпечанасьць насельніцтва прадуктамі харчаваньня ў 1994 годзе ўпершыню за апошнія гады апынулася ніжэй мінімальных нормаў па зерні на 25 прац., па мясу - на 24 прац., па малаку - на 15 прац. Паляпшэньня справы ў 1995 годзе не чакаецца. Толькі за апошнія тры месяцы краіна страціла ў выніку падзяжу амаль 400 тыс. галоў жывёлы. Запасы кармоў меншыя за мінулагодні на адну трэць. Працягваецца цэнавы "разбой". Прадукцыя забіраецца ў вытворцы па цэнах, у 4-5 разоў меншых, чым розьнічныя цэны ў магазінах. Выкарыстоўваецца механізм інфляцыі дзеля абагачэньня наменклатуры, расьце карупцыя, пашыраецца злачыннасьць, ініцыіруецца наступ найбольш адсталых і рэакцыйных сіл на беларускую культуру і дэмакратыю.

Палітычныя і эканамічныя дзеяньні кіраўніцтва краіны накіраваны не на абарону нацыянальных інтарэсаў Беларусі, а на задавальненьне дамаганьняў расейскіх (і зьвязаных з імі беларускіх) фінансава-прамысловых карпарацыяў (канцэрнаў, саюзаў, таварыстваў і т.п.). Пачаўся гандаль нацыянальнай маёмасьцю, выношваюцца планы здачы беларускай уласнасьці расейскім манаполіям, тым, што вызначаюць дзяржаўную палітыку ў Расеі; падрыхтаваны праект мытнага саюза з Расеяй, у выніку якога павінен быць па задуме практычна ліквідаваны беларускі экспарт і беларуская самастойнасьць у гандлі, у справах транзіту па сваёй тэрыторыі і г.д. Беларусь уцягваецца ў так званую калектыўную бясьпеку з Расеяй (якая вядзе агрэсіўныя войны), заганяецца ў эканамічны саюз на нераўнапраўных умовах, у інфармацыйную прастору, дзе дамінуе расейская імперская прапаганда. Прэзідэнцкая дзейнасьць на Беларусі - гэта працяг заганнай дзейнасьці дэпутацкай большасьці Вярхоўнага Савета, якая пажынае цяпер плады сваёй дрэннай працы.

Антынацыянальная палітыка кіраўніцтва Беларусі можа прывесьці да поўнага разбурэньня слабога яшчэ беларускага прадпрымальніцтва і банкаўскай справы (якія будуць проста праглынутыя расейскімі кампаніямі і манаполіямі), да яшчэ больш рэзкага пагаршэньня жыцьця людзей, якія будуць жыць на сваёй зямлі: але яна перастане ім ужо належыць, будуць працаваць на заводах, прыбытак з якіх будзе атрымліваць не Беларусь, а маскоўская фінансавая дзелавая наменклатура. Такая палітыка можа прывесьці да ліквідацыі незалежнасьці дзяржавы, да поўнай галечы беларускага народа, да велізарных стратаў, непапраўнага глуму і вынішчэньня нацыянальнага, матэрыяльнага і культурнага дабра.

Суседнія з Беларусьсю дзяржавы (Польшча, Летува, Чэхія, Вугоршчына і інш.) дэманструюць і канструктыўныя падыход, і канструктыўныя дасягненьні ў паляпшэньні эканамічнага становішча і дабрабыту сваіх грамадзян. Гэта сьведчаньне перш за ўсё нармальнага вырашэньня палітычных пытаньняў, вынік разумнай працы ў інтарэсах сваёй дзяржавы і свайго народа.

Ценявы Кабінет міністраў Апазіцыі БНФ лічыць неабходным пазнаёміць грамадзкасьць краіны з вынікамі аналізу становішча, паказаць яго сур'ёзнасьць, велізарную небясьпеку для нашай дзяржаўнай і нацыянальнай будучыні. Неабходна прымаць эфектыўныя захады па зьмяненьню гэтага стану дзеля ўратаваньня нашай уласнасьці, эканомікі і дзяржавы.

Прынята і абмеркавана на пасяджэньні Кабінета 27.12.1994.

ПРАЦЭС ПАЙШОЎ І... СПЫНІЎСЯ

5 студзеня у нарсудзе Савецкага раёна Менска аднавіўся працэс па іску экс-міністра абароны Беларусі П.Казлоўскага да галоўнакамандуючага А.Лукашэнкі, газеты "Звязда" і карэспандэнта М.Дзябёла. Генерал Казлоўскі ў парадку кампенсацыі за маральныя страты запатрабаваў спагнаць на яго карысьць з прэзідэнта 30 мільёнаў рублёў, з газеты і яе карэспандэнта - 5 і 10 мільёнаў адпаведна.

Разгляд справы быў адкладзены па прычыне адсутнасьці Лукашэнкі і яго прадстаўніка.

СІМ


ВЫБІРАЙЦЕ!

Калі сканала імперыя камуністых СССР, то наўзамен інтэрнацыяналізму на абшарах пост-камуністычнага рэжыму паўстаў так добра знаны ў 18-м і 19-м стагоддзях расейскі імперыялізм. Не будзем сягаць глыбока ў гісторыю, але лучнасьць часу наяве. Успомнім тут, на нашай зямлі, вядомае "Русское братство" ці "Союз защиты веры и Отечества" і сучасныя рухі "Очищение", "Союз Офицеров", "Славянский Собор". Мэта іх адна: зьліквідаваць незалежную Беларусь, стварыць на нашай зямлі царства манкуртаў альбо загубіць нашу Бацькаўшчыну "высакароднай" ідэяй брацтва славянскіх народаў.

Так, на першы погляд, мэты знаёмыя. На самой справе гэта не так, бо грунт гісторыі яскрава сьведчыць пра іншае. Расейцы, нават пры ўсіх інтэрнацыяналістычных памкненьнях уладаў камуністых, былі пануючай нацыяй. Іх мова, культура, традыцыі былі нібы маяком для астатніх. Расейскі менталітэт разьвіваўся, рос у розных прапорцыях. Час вызначыў імпэт росту і аўтарытэт. Але здарылася адваротнае, калі рост апярэдзіў аўтарытэт. Малыя і больш вялікія народы пажадалі жыць па-свойму, адметна. Захаваць спадчыну, якую ім наканавалі прашчуры. Вось гэта вялікім інтэрнацыяналістам і апынулася не да густу. Усе, хто ўспомніў пра свае карані, маланкава былі абвешчаны нацыяналістамі, ворагамі. Таму супраць нацыяналістаў і ворагаў трэба весьці барацьбу. КДБ і МУС, якія пасьля развалу СССР у спадчыну атрымала Расея, ведалі, як гэта зрабіць. Інтрыганства, абарона правоў расейскамоўнага насельніцтва - вось галоўныя накірункі вышкаленых цэрбераў ад КДБ і МУС. Яны ведаюць, што рабіць, яны ведаюць, як дзейнічаць. Таму не баяцца нахабнасьці: за імі "Астанкіна", за імі "Маяк", за імі інстытуты, што спецыялізуюцца на дэзінфармацыі.

Супрацьстаяць ім цяжка, але можна. Найлепш гэта рабіць тады, калі нацыя, народ за тое, каб на сваёй зямлі панавала сваё. Хто гэта зразумеў раней, той сёньня прызнаны цывілізаваным сьветам. А хто яшчэ верыць у "сьветлую будучыню", тым у спадчыну - "Саюз Афіцэраў" і "Славянскі Сабор".

А.ЗАХАРАЎ, Р.ФАРМАНЯН,
сябры Гарадзенскай рады Беларускага Народнага Фронту.



ЗАЯВА

Дэпутацкай Апазіцыі Беларускага Народнага Фронту

Працягваецца мужная барацьба свабодалюбівага чачэнскага народа з расейскім рэгулярным войскам, якое па загаду імперскіх палітыкаў Расеі ўварвалася ў Чачэнскую рэспубліку, сее сьмерць, разбурэньні, зьнішчае грамадзянскае насельніцтва. Расейскія імперскія палітыкі, што даўно адмовіліся ад дэмакратыі, распачалі брудную, жорсткую вайну супраць невялікай каўказскай краіны. Яны растапталі дэмакратычныя прынцыпы, законы, правы чалавека, мараль, правы нацый на самавызначэньне, давер народаў. У інтарэсах новых расейскіх карпарацыяў, манаполіяў і капіталу вядзецца жорсткая бесчалавечная вайна з прымяненьнем самай сучаснай зброі і фактычна за вароты на Каўказ, за нафтавыя камунікацыі і нафту. Імперскія сілы, сілы вайны, якія кіруюць Расеяй, паказалі ўсяму сьвету сваё жудаснае абліччa, пацьвердзілі, што яны гатовыя на ўсё і не спыняцца ні перад якой жорсткасьцю, ні перад якой крывёй.

Але Чачэнская рэспубліка не ўдзельнічала ў галасаваньні за расейскую канстытуцыю. Чачэнскі народ увесь час змагаўся за сваю свабоду і незалежнасьць, быў уключаны ў расейскую імперыю сілай зброі. Вайсковая аперацыя супраць цэлага народа, які ўжо падвяргаўся расейскаму генацыду і дэпартацыі, - недапушчальная, вайна супраць яго - ганебная для тых, хто яе распачаў. Гэта злачынства супраць народа і яго права на самавызначэньне. Ніякія інтарэсы палітыкаў не вартыя страты жыцьцяў людзей. Такія палітыкі павінны несьці крымінальную адказнасьць за злачынствы супраць чалавецтва, за сьмерць людзей, за забойствы па іхніх загадах.

Мы з трывогай назіраем, што сілы імперыялізму, агрэсіі і вайны, што ўзмацнелі ў Расеі, ствараюць пагрозу міру ў дачыненьнях з народамі ў самой Расеі і з суседнімі краінамі і незалежнымі дзяржавамі.

Мы патрабуем спыніць вайну ў Чачні і неадкладна вывесьці адтуль усе акупацыйныя войскі. Мы зьвяртаемся да міжнароднай супольнасьці - узвысіць свой голас у абароны маленькай краіны і свабодалюбівага народа. Толькі народ праз сваю волю можа вызначыць у сваёй незалежнасьці і ў сваім лёсе без чужых танкаў і войска, без крыві і зброі.

Дэпутаты Апазіцыі БНФ у Вярхоўным Савеце: З.Пазьняк, В.Голубеў, Л.Баршчэўскі, І.Германчук, Л.Зданевіч, Ул.Заблоцкі, А.Трусаў, Г.Сямдзянава, І.Пырх, С.Антончык, С.Навумчык, М.Крыжаноўскі, Л.Дзейка, М.Маркевіч, В.Аляміеў, А.Шут, П.Холад, С.Папкоў, В.Малашка, В.Какоўка, Б.Гюнтар, Ю.Беленькі.

У ДОМЕ ЎРАДУ

З 10 студзеня ў Доме ўраду ўведзены новы прапусковы рэжым. Зараз наведвальнікам, каб прайсьці ва ўрадавыя пакоі, у абавязковым парадку неабходна атрымаць адпаведны дакумент у бюро прапускоў. Існуючае раней "тэлефоннае права", калі ахова прапускала жадаючых пасьля кароткай размовы па вяртушцы, адменена.

Новы прапусковы рэжым у Доме ўраду ўведзены з мэтай лепшай аховы Прэзідэнта.

СІМ

ГІСТОРЫЯ НАМ ПАКІДАЕ ШАНЦ. МАЖЛІВА, АПОШНІ...

Ці патрэбен Беларусі дагавор аб дружбе, добрасуседзтве і супрацоўніцтве з Расеяй?

Пытаньне, вынесенае ў падзагаловак, зусім не рытарычнае. Так наканавана нам, беларусам (наканавана, праўда, не ведаю кім: лёсам, д'яблам ці Богам) жыць побач з вялікім суседам - Расеяй: краінай, якая, нягледзячы на ўсе ўнутраныя складанасьці, застанецца супердзяржавай, з якой вымушаны лічыцца ўсе. Таму было б вялікім глупствам ісьці на жорсткую, дэструктыўную канфрантацыю з ёю.

Былы Савецкі Саюз па сутнасьці быў эканамічна замкнёнай сістэмай, якая магла існаваць сама па сабе, адгараджваючыся ад сусьветнага супольніцтва, ад сусьветных рынкаў тавараў. Аналіз эканамічнай сітуацыі ў краінах СНД сьведчыць аб тым, што да сёньняшніх рэалій змагла ў пэўнай ступені прыстасавацца толькі Расея, бо структура яе эканомікі, за некаторым выключэньнем, нагадвае таксама замкнёную сістэму.

Што тычыцца нашай рэспублікі, то яе эканоміка зарыентавана на рынкі суседніх дзяржаў, у пераважнай ступені на расейскі. Да асаблівасьцей беларускай прамысловасьці можна аднесьці і звышманапалізацыю па сусьветных стандартах - 46,6 працэнта (гэта значыць, прадпрыемства выраблае прадукцыю, аналагаў якой у рэспубліцы няма).

(Працяг на 3 стар.).

ГРАМАДЗТВА

ГІСТОРЫЯ НАМ ПАКІДАЕ ШАНЦ. МАЖЛІВА, АПОШНІ...

Не вельмі прыемныя і наступныя макраэканамічныя паказчыкі: зношанасьць асноўных фондаў на прадпрыемствах рэспублікі ўжо перавышае 65 працэнтаў, а на некаторых прадпрыемствах дасягае 75; нізкі ўзровень тэхналагічнага развіцьця (па ацэнках спецыялістаў, адставаньне машынабудаўнічага комплекса ад адпаведнага заходнегерманскага складае амаль 40 гадоў). І самае небясьпечнае - вымываньне інтэлекту са сферы навукова-тэхнічнага абслугоўваньня прамысловасьці. У гэтым кантэксьце вельмі дзіўным выглядае "разгон", які наладзіў прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падчас сустрэчы з супрацоўнікамі Акадэміі навук. Маўляў, дрэнна працуеце, няма новых ідэй, распрацовак. А дзе ж ім быць, калі самыя энергічныя, дасьведчаныя навукоўцы не жадаюць працаваць за жабрацкую па сёньняшніх мерках зарплату).

Менавіта вышэйпералічаныя фактары і не даюць мажлівасьці ўзьняцца беларускай эканоміцы, выпускаць прадукцыю, канкурэнтназдольную па сусьветных стандартах. Не трэба замоўчваць і эканамічную экспансію, якая праводзіцца расейскімі кіруючымі коламі ў адносінах новых незалежных рэспублік, у тым ліку і Беларусі. Расея, карыстаючыся выключным становішчам, праз эканамічныя рычагі (манапольнае права пастаўкі на Беларусь нафты, газу, электраэнергіі) спрабуе частку свайго эканамічнага цяжару скінуць на чужыя плечы, зрабіць эканоміку Беларусі прыдаткам сваёй эканомікі. Зімой-вясной мінулага года тона нафты нам абыходзілася па 128 долараў, калі кошт на Ратэрдамскай нафтавай біржы дасягае 91 долара (сяроднестатыстычны сусьветны кошт). Ішлі за бясцэнак, па дэмпінгавых коштах беларускія трактары, МАЗы, тэлевізары, прадукцыя сельскай гаспадаркі. Ці не паўторыцца падобнае і вясной 1995 года, калі надыдзе час разьлічвацца за нафту і газ? Чым мяркуе разьлічвацца наш прэзідэнт? Можа, як і былы прэм'ер-міністр Вячаслаў Кебіч, аддаючы за бясцэнак самыя "прывабныя кавалачкі" прамысловасьці, энергетычнага комплексу? А такія захады ўжо робяцца. Зноў узьнялося пытаньне з "Белтрансгазам", прадпрыемствам, якое ажыцьцяўляе перапрацоўку і транзіт расейскай нафты за мяжу. Тады Вячаслаў Францавіч ацаніў "Белтрансгаз" у 1,9 мільярда расейскіх рублёў. Якая лічба будзе сёньня?

Не лічу сябе нейкім кансерватарам, чалавекам, які прытрымліваецца архаічных поглядаў. Так, патрэбны акцыяніраваньне, прыватызацыя таго ж "Белтрансгазу", іншых прадпрыемстваў з мэтай удасканаленьня іх працы, прыцягненьня замежных інвестыцый у эканоміку краіны. Але становіцца не па сабе, калі за бясцэнак распрадаецца, расьцягваецца тое, што напрацавана пакаленьнямі беларусаў, іх потам...

Але вернемся да дагавору аб дружбе, добрасуседстве і супрацоўніцтве з Расеяй. Ці патрэбны ён?

Нягледзячы на ўсё сказанае вышэй, лічу, што патрэбен. Бо Беларусь у сілу свайго геапалітычнага становішча на карце Эўропы, у сілу склаўшайся структуры эканомікі мусіць быць адкрытай краінай не толькі эканамічна, але і палітычна.

Не сакрэт, што заходнія краіны разглядаюць нашага суседа, у першую чаргу, як экспарцёра сыравінных матэрыялаў, аграмністай краіны-рынка з патэнцыяльна вялікімі спажывецкімі здольнасьцямі, з патэнцыяльна эфектыўным укладаньнем капіталаў.

Якая роля ў гэтым кантэксьце адводзіцца Беларусі? Пакуль ніякай. Яна разглядаецца праз расейскую прызму. Але мажлівасьці для таго, каб вызначыць гэтую ролю з мэтай эканамічна падняцца з каленяў, ёсьць. І немалыя. Пры адной умове - праводзіць разумную, дзяржаўную палітыку.

Прыкладаў вельмі шмат. Транзіт нафтавы, газавы, дарожны, чыгуначны. Ён у стане забясьпечыць патрэбу краіны ў энерганосьбітах (16 мільёнаў тон у год, і гэта пры нашым неэфектыўным выкарыстаньні энерганосьбітаў).

Па-другое. Замежныя інвестыцыі ў эканоміку краіны. Ці не вартыя былі ўвагі пры разумных законах прапановы германскай авіякампаніі "Люфтганза" у 1992 годзе, каб перабудаваць першы Менскі аэрапорт, зрабіць яго "перавалачнай базай" з Усходу на Захад і з поўдня на поўнач Эўропы? Альбо прапанова фірмы "Мерседэс" аб стварэньні на базе Жодзінскага аўтамабільнага завода прадпрыемства па зборцы адпаведных легкавых аўтамабіляў з прыцэлам на расейскі рынак, які на сёньняшні момант зьяўляецца адным з буйнейшых спажыўцоў прадукцыі гэтай фірмы?

Такія прапановы не адзінкавыя. Але для гэтага патрэбна палітычная, заканадаўчая воля. Для гэтага патрэбна прыняць адпаведныя законы аб продажы зямлі, аб стварэньні ўмоў для замежных інвестараў. Але наш Вярхоўны Савет да прыняцця падобных рашэньняў яшчэ "не дарос" і, мяркуючы па ўсім, ужо "не дарасьце"...

Вышэй быў закрануты асьпект адкрытасьці эканомікі рэспублікі. А быць эканамічна адкрытым без палітыкі "адкрытых дзьвэрэй" немажліва.

Зразумела, расейскі ўрад будзе спрабаваць аказваць ціск і на зьнешнепалітычную дзейнасьць нашай краіны. Не толькі праз дзяржаўныя інстытуты, але і праз грамадзкія арганізацыі. Такія, напрыклад, як "Фонд дапамогі сербам", які ўзначальвае вядомы беларускі пісьменьнік Іван Чыгрынаў. Навошта нам дзейнічаць у фарватэры расейскага зьнешнепалітычнага ведамства і бачыць у тых жа харватах ці мусульманах у палаючай Босьніі ворагаў? Ах, маўляў, сербы - праваслаўныя, і мы, беларусы, адносімся да гэтай канфесіі. А ці так? Для даведкі: на Беларусі на сёньняшні дзень пражывае 1,2 мільёна каталікоў, прыкладна такая ж колькасьць пратэстантаў і каля пяці мільёнаў праваслаўных. Астатнія - іудзеі, мусульмане ці людзі, якія не вызнаюць сваёй прыналежнасьці да нейкай канфесіі. Няўжо на Беларусі не хапае надзённых эканамічных, палітычных, сацыяльных праблем? Няўжо трэба падліваць масла ў рэлігійнае міжканфесійнае вогнішча, абражаць рэлігійныя пачуцці людзей? Бо беларусы пры монаэтнічным складзе нацыі (у рэспубліцы пражывае 78 працэнтаў беларусаў па нацыянальнасьці) уяўляе вельмі цікавае відовішча па моўнай, эканамічнай, рэлігійнай ментальнасьці.

Найбольш у зьнешняй палітыцы прымальным варыянтам для Беларусі было б далучэньне да Вышэйгародзкай групы, якая аб'ядноўвае ў сваіх шэрагах краіны, прыблізна падобныя па тэрыторыях, колькасьці насельніцтва, структуры эканомікі (Чэхія, Славакія, Венгрыя і Польшча). Прапановы далучыцца да гэтай чацьвёркі беларускаму боку ўжо былі даўно. Але наша дзяржаўная кіраўніцтва пакуль чакае. Чым выгодна блакіраваньне з Вышэйгародзкай групай?

Па-першае, дыстанцыяваньне ў неабходных межах ад палітыкі Расеі, магчымасьць праводзіць самастойную палітыку, абапіраючыся на аўтарытэт сусьветнага грамадзтва (зразумела, Вышэйгародзкая група не існуе сама па сабе: у эўрапейскім кантэксьце яна разглядаецца як калідор паміж краінамі Заходняй Эўропы, далучанымі да НАТА, і Расеяй).

Па-другое, прыналежнасьць да гэтага блоку дазволіла б Беларусі больш актыўна выходзіць на рынкі ўсходнеэўрапейскіх краін, а праз партнёраў па блоку - і на Захад...

І напрыканцы. Вялікі дэмограф, сацыяэканаміст Мальтус пісаў: "Нацыі, згубіўшыя сваё аблічча - эканамічнае, палітычнае, дэмаграфічнае - вырачаны на забыцьцё. Але гісторыя заўсёды пакідае шанц. Бывае, што апошні шанц..."

Перакідваючы масток у сучаснасьць, трэба пазначыць злабадзённасьць слоў выдатнага ангельскага навукоўца (дарэчы, ягонае імя, яго думкі, ідэі былі незаслужана зганьбаваны ў так званай савецкай навуцы). Наша краіна апынулася на той мяжы, пераступіўшы якую, мы, беларусы, як нацыя можам адыйсьці ў небыцьцё. І дагавор аб дружбе, добрасуседстве і супрацоўніцтве з Расеяй (у залежнасьці ад тых асноўных, краевугольных пастулатаў, на якіх будуць узьведзены адносіны паміж дзьвюма краінамі) у асноўным будзе вырашальным у нашым лёсе, у лёсе нашай Бацькаўшчыны.

Ігар ХОМІЧ,
журналіст.

ПРЭЗЕНТЫ ГЕНЕРАЛЬНАГА КОНСУЛА

Генеральны консул Рэспублікі Польшча ў Горадні Мар'януш Машкевіч уручыў каляндныя падарункі для дзяцей-сірот Парэчскай школы-інтэрната Гарадзенскага раёна. Падарункі, а ў асноўным гэта прысмакі, былі перададзены ў Генеральнае Консульства ў Горадні праз дабрачынныя арганізацыі Польшчы.

Падчас кароткай сустрэчы з кіраўніцтвам школы спадар Мар'януш Машкевіч паабяцаў дапамагчы дзеткам і вопраткай.

Г.АСТРОЎСКІ.

КРОПКА НА ПРАЦЫ РАДЫЁКРОПКІ

Каля сямідзесяці працэнтаў радыёкропак не працуюць са студзеня ў мястэчку Парэччa, што ў Гарадзенскім раёне.

Прычына - сувязісты не маюць сродкаў, каб набыць новы дрот для праваднoй радыёсеткі, а таксама на заказ новых апараў.

Г.ПАДЛЯШУК.

Біскуп Гарадзенскай каталіцкай дыяцэзіі А.Кашкевіч высьвяціў прадстаўніцтва міжнароднай дабрачыннай арганізацыі "Карытас".

Г.Д.

ЯК НАС АБСЛУГОЎВАЮЦЬ

У Гарадзенскім аблвыканкаме адбылася прэс-канферэнцыя на тэму "Стан жыльлёва-камунальнай гаспадаркі і перспектывы яе развіцьця". Свой выступ на ёй начальнік вытворчага ўпраўленьня жыльлёва-камунальнай гаспадаркі аблвыканкама С.Рысік пачаў з таго, што паведаміў аб адмене Міністэрствам эканомікі рэспублікі свайго рашэньня аб павышэньні з 1 студзеня цэн на камунальныя паслугі. Па меншай меры, да сакавіка яны, акрамя як на электрычнасьць, не будуць павялічвацца. Ён таксама сказаў: "Альтэрнатывы ўвядзеньня безнаяўных жыльлёвых субсідый няма". А яны будуць налічвацца толькі тым сем'ям, у якіх на аднаго чалавека прыпадае 9-12 квадратных метраў жылплошчы (аблвыканкам, магчыма, у хуткім часе прыме наконт гэтага спецыяльнае рашэньне). Але нават пасьля павышэньня кошту камунальных паслуг насельніцтва будзе аплочваць да 20 працэнтаў іх сабекошту (зараз - 1-3 працэнты).

Потым С.Рысік спыніўся на прыватызацыі жыльля. У вобласьці на пачатак 1995 года прыватызавана сорак працэнтаў жыльлёвага фонду, у тым ліку ў Горадні - 32, на Смаргоншчыне - 56, а на Астравеччыне - ажно 63 працэнты. Па рэспубліцы гэты паказчык складае ў сярэднім 28 працэнтаў. Акрамя таго, 36,9 працэнта кватэраўладальнікаў была налічана жыльлёвая квота (на Беларусі - 24,7 працэнта). С.Рысік супакоіў прысутных, што ў бліжэйшы час увядзеньне дадатковых падаткаў на прыватызаванае жыльлё не прадбачыцца. Але ж будзе праведзена пераацэнка кватэр, бо, на думку Станіслава Альбінавіча, не зьяўляецца нармальнай сітуацыя, калі за жыльлё, пабудаванае ў 1989 ці 1994 гадах, людзі плоцяць розныя грошы.

Як сказаў начальнік упраўленьня ЖКГ аблвыканкама, па-ранейшаму датуюцца з бюджэта пяць відаў жыльлёва-камунальных паслуг: летась сума датацый склала 49 мільярдаў рублёў. Але ж засталася запазычанасьць за газ (7,5 мільярда), цяпло (4,2 мільярда), электраэнергію (1,4 мільярда рублёў). Адначасова прыкладна 7 мільярдаў рублёў вінаватыя камунальнікам спажыўцы: бюджэтныя арганізацыі, прамысловыя прадпрыемствы.

Па-ранейшаму шмат грошай патрэбна на будаўніцтва водазабораў, ачышчальных збудаваньняў, капітальны рамонт жыльля. Раней на гэтыя мэты прыцягваліся сродкі прадпрыемстваў, але, па словах С.Рысіка, ужо на працягу трох гадоў усё робіцца за кошт бюджэта. Плануецца, што да канца года прамысловыя гіганты Горадні ВА "Азот" і "Хімвалакно" зьвяжа тралейбусная лінія. На яе абсталяваньне выдаткавана 1,5 мільярда рублёў, для заканчэньня патрэбна столькі ж. Цяжка спадзявацца жыхарам вобласьці, што ў іх дамах не будзе цячы дах і будзе зроблены капітальны рамонт. Калі летась на гэтыя мэты было выдзелена 54 працэнты ад патрэбнай колькасьці сродкаў, то сёлета прадугледжана толькі 22. Выйсьце бачыцца ў долевым удзеле камерцыйных структур і прадпрыемстваў.

На пытаньні журналістаў адказаў начальнік аддзела жыльлёва-камунальнай гаспадаркі Гарадзенскага гарвыканкама В.Шпак. Прынамсі, ён паведаміў, што толькі сёлета вырашыцца пытаньне з вызначэньнем месца пад гарадзкую сьметніцу. Адведзена тры месцы, сёлета пачнецца праектаваньне, а ў будучым годзе - будаўніцтва. Мяркуецца, што сьметніца будзе адпавядаць эўрапейскім стандартам.

Шмат праблем існуе з панэльнымі дамамі, пабудаванымі ў 60-тыя гады: цякуць дахі, сьцянныя стыкі. Выйсьце бачыцца ў прыцягненьні сродкаў камерцыйных структур, перадачы на конкурснай і аўкцыённай аснове будынкаў новым уладальнікам і стварэньні калектываў індывідуальных забудоўшчыкаў (адзін дом у горадзе такім чынам ужо адрамантаваны).

Журналістамі было закранута таксама пытаньне, зьвязанае з устаноўкай у кватэры лічыльнікаў цяпла і вады. В.Шпак адзначыў, што фактычна кватэранаймальнікі спажываюць іх на 30 працэнтаў менш, чым устаноўлена. Але ж каб кампенсаваць выдаткі на ўстаноўку лічыльнікаў, патрэбна звыш 5 мільярдаў рублёў - такіх грошай няма ў бюджэце.

Вячаслаў Леанідавіч таксама паведаміў, што ў Горадні не прадбачыцца будаўніцтва крэматорыя. У той жа час распрацавана праектна-каштарысная дакументацыя абсталяваньня новых могілак, бо старыя хутка не змогуць умясьціць усіх нябожчыкаў (калі раней іх хавалі 5-7 штодня, то зараз - 10-14).

Напрыканцы прэс-канферэнцыі С.Рысік сказаў, што работнікі жыльлёва-камунальнай гаспадаркі будуць і надалей клапаціцца аб стварэньні належных умоў для жыцьця людзей.

А.ДУК.



АБСЛУГОЎВАЕ АДНАВЯСКОЎЦАЎ

Валянціна Аркадзьеўна Пілько працуе загадчыцай крамы вёскі Пясчанка Скідальскага спажывецкага таварыства. Пасьля заканчэньня вучобы ў Гарадзенскім кааператыўным тэхнікуме не стала шукаць цёплае месца ў горадзе, а вярнулася ў сваю вёску, дзе працуе ўжо з 1981 года.

І.БАРЫСАЎ.

На здымку: В.А.Пілько падчас працы (фота аўтара).

ПАЖАР НА СТУДЫІ ТЭЛЕБАЧАНЬНЯ

Сярод бела дня ў апаратнай Гарадзенскага тэлерадыёцэнтра адбылося ўзгараньне акумулятараў для відэакамер. Яны былі пакінуты на падзарадку і засталіся без нагляду. Дзякуючы намаганьням пажарных, якія хутка прыбылі на месца здарэньня, удалося пазьбегнуць вялікіх страт матэрыяльных каштоўнасьцяў. Але агнём зьнішчана шафа, у якой знаходзіліся батарэі, самі батарэі і закопчаны сьцены.

Па словах аднаго з работнікаў Гарадзенскага дзяржтэлерадыёкамітэта, калі ўваходзіш у апаратную, складваецца ўражаньне, быццам там вэндзілі мяса.

А.Г.



СУМЕЖЖА

ВІЛЕНСКІЯ ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

КАРОЛЬ ЭКСЬЛІБРЫСАЎ ЖЫВЕ Ў ВІЛЬНІ

Хто ён? Іосіф Шапіра - мецэнат і апякун жыдоўскай культуры. Ён сабраў самую вялікую калекцыю кніжных знакаў. Гэта пацьверджана Міжнароднай асацыяцыяй калекцыянераў, членам якой зьяўляецца і Шапіра. У ягонай калекцыі больш за 120 тысяч эксьлібрысаў, якія ён набыў, галоўным чынам, дзякуючы абмену з мастакамі сьвету. Нават у Лонданскім дзяржаўным музеі знаходзіцца крыху больш за 100 тысяч. І.Шапіра ўдзельнічаў у шматлікіх міжнародных конкурсах эксьлібрысаў як адзіны прадстаўнік Летувы і былога Саюза. На выставах у Італіі, Нямеччыне, Польшчы ён атрымаў каля 50 узнагарод. Шапіра зьяўляецца таксама і старшынёй клуба філатэлістаў. Дома ў яго вялікая колькасьць марскіх ракавін, калекцыя мінералаў, каралаў, больш за 700 збаноў.

Пры Дзяржаўным жыдоўскім музеі Шапіра вырашыў заснаваць свой фонд. Перанёс туды ўсю сваю калекцыю. Па спецыяльнасьці ён інжынер-паліграфіст. Амаль сорак гадоў ён працаваў у Камітэце па друку. Складаў крыжаванкі, галаваломкі, матэматычныя задачы, выпусьціў кнігу. За ганарары і папаўняў свае калекцыі. Цяпер жыве толькі на пеньсію. Адкуль цяга да калекцыяніраваньня? Гэта ад бацькоў, дзядоў, прадзедаў. Усе нешта калекцыяніравалі: прадзеды - кнігі, жыдоўскія малітоўнікі, бабка - паштоўкі, дзед - манеты, бацькі - маркі і манеты.

Калекцыянерам Іосіф стаў, калі яму выкладчык Віленскага ўніверсітэта Кісін падарыў тры эксьлібрысы.

Для мастакоў планеты гонар - зрабіць эксьлібрыс каралю. Мастакі, якія спецыяльна зрабілі для Шапіры звыш 150 эксьлібрысаў, раскрылі ягоны характар, цягу да тэатра, паляваньня, кніг. І.Шапіра зрабіў сам сабе каля дваццаці кніжных знакаў.

"Вяртаючыся дамоў стомленым, возьмеш эксьлібрыс, пачнеш разглядаць, чаму мастак намаляваў так, а не інакш, і адчуваеш, як супакойваецца нервовая сістэма", - гаворыць Шапіра.

Жыдоўскі музей, які знаходзіцца ў цэнтры Вільні, наведваюць розныя людзі. Адзін архітэктар напісаў: "Я знаходжуся пад вялікім уражаньнем таго, што можа зрабіць адзін чалавек, які бязьмежна любіць культуру свайго народа, яго звычаі, мастацтва, людзей..."

Уладзіслаў СТРУМІЛА.

РАЗАГНАЛІ ФІРМУ «ЧАРОЎНЫХ СПАДАРОЖНІЦ»

Каўнаская паліцыя прыпыніла дзейнасьць яшчэ адной фірмы "чароўных спадарожніц". Затрыманы работнікі (мужчына і жанчына), якія прымалі заказы, і восем "спадарожніц", якім ад 19 да 24 гадоў. Двое з іх - мясцовыя, астатнія - прыезжыя (з Калінінграда, Менска, Горадні, Варонежа). Адна нядаўна ўжо затрымлівалася, яна на шостым месяцы цяжарнасьці.

Незарэгістраваная фірма, якая дзейнічала каля года, спачатку называлася "Ласкавыя рукі", затым - "Ларыга". У яе былі дзьве канторы, дзе прымаліся заказы. Дзяўчыны жылі на кватэрах, па дзьве-тры ў пакоі.

Сабраўшы інфармацыю, паліцыянты пад выглядам кліентаў выклікалі на кватэру двух "спадарожніц". Спачатку прыехаў вадзіцель. Ніякіх падазрэньняў у яго не зьявілася. Потым даставілі дзьвюх дзяўчат. Пасьля разьліку ўсе трое былі затрыманы.

У абедзьвюх канторах і на кватэрах, дзе жылі "спадарожніцы", паліцыянты затрымалі астатніх прастытутак і яшчэ трох работнікаў фірмы. Яе ўладальніка, 25-гадовага нідзе не працуючага жыхара Каўнаса, дома не знайшлі.

"Ларыга" - ужо дванаццатая фірма, ліквідаваная за мінулы год. Але, па словах паліцыянтаў, іх колькасьць не зьмяншаецца, яны пасьпяхова маскіруюцца. Зараз па тэлефону ўжо не абмяркоўваюць фізічныя дадзеныя жывога тавару. Размова ідзе аб колеры букета, памеры кветак, паху. Да кліентаў "спадарожніц" прывозяць пад выглядам "хатніх гаспадынь" з вёдрамі і шчоткамі. Заказы ў канторах звычайна не рэгіструюцца, таму даказаць, што тут працуюць прастытуткі, вельмі цяжка.

Затрыманыя "спадарожніцы" прызналіся, што займаліся прастытуцыяй. Тыя, што прыехалі з Расеі і Беларусі, павінны быць вернуты назад, але ў іх няма пашпартоў. Дакументы знаходзяцца ў гаспадара фірмы, але яго пакуль не знайшлі. Мясцовых адпусьцяць, ім пагражае толькі штраф у памеры больш ста літаў. "Шэф" можа атрымаць 3-5 год пазбаўленьня волі з канфіскацыяй маёмасьці, але можа абысьціся і штрафам. Суды звычайна штрафуюць у такіх выпадках на паўтары тысячы літаў.

LR

«ФАЙНЕНШЛ ТАЙМС» - ПРА ЛЕТУВУ

У канцы лютага ў Летуву прыбудуць рэпарцёры з "Файненшл таймс". Газета мае намер на сваіх старонках расказаць пра эканоміку балтыйскай краіны, яе банкі і фінансы, прыватызацыю, замежную палітыку, асобныя сферы прадпрымальніцтва. Плануецца, што эканамічны агляд Летувы будзе надрукаваны ў нумары за 14 сакавіка.

Нядаўна газета падрыхтавала чатырохпалосны дадатак, прысьвечаны Латвіі.

СЬМЕРЦЬ НА ПРАЦЫ

Урад Летувы зацьвердзіў палажэньне аб налічэньні дапамогі, калі работнік загінуў на працы ў выніку няшчаснага выпадку.

Прадугледжана, што дапамога будзе выплочвацца, калі работнік загінуў у выніку парушэньня нарматыўных актаў аховы працы. Дапамога зьяўляецца адзінчасовай і павінна складаць не менш 500 мінімальных штомесячных заробтных плат, памер якіх вызначаны ўрадам.

МГ

СТРАЧАНЫЯ МІЛЬЁНЫ

Як толькі выбухі шампанскага абвясьцілі надыход Новага Года, Польшча, у якой бадай кожны чалавек быў мільянерам, здала свае "заваёвы". "Але гэта справядліва, - лічыць звычайны абывацель гэтай краіны. - Быць мільянерам, маючы наяўнымі 40 доляраў, непачэсна".


Таму закрэсьленыя з першага студзеня па загаду нацыянальнага банка чатыры нулі скасавалі гэтую недарэчнасьць.

Цяпер адзін долар ЗША будзе роўны прыкладна 2,4 злотага, а той, хто меў зарплату ў пяць мільёнаў злотых (каля 200 доляраў), будзе мець усяго 500 злотых.

(з.д.)

Беласточчына - згустак Беларушчыны Польшчы. Аздабляюць культурную спадчыну беларусаў дзесяткі праваслаўных храмаў.

НА ЗДЫМКУ: Царква Ўваскрашэньня ў Бельску.



КРЫКУН ПААБЯЦАЎ МАЎЧАЦЬ

Беспрацоўны пьянчужка з расейскага горада Чарапавец два дні запар крычаў пад вокнамі адной чарапавецкай фірмы, абвінавачваючы злыдняў-камерсантаў ва ўсіх грахах.

Утаймаваць крыкуна было немагчыма нават гарэлкай. Не вытрымаўшы абразаў, намесьнік дырэктара фірмы выйшаў і падстрэліў крыкуна з газавага пісталета.

Перапалохаўшыся садзеянаму, "сьмелы" намесьнік пачаў адпойваць сваю ахвяру каньяком. Крыкун у момант ажыў і запатрабаваў за нанесеныя шкоды тры бутэлькі гэтага напою. Атрымаўшы "кампенсацыю", крыкун-вымагальнік паабяцаў болей не крычаць.

ГРУЗАВІК СЯРОД АКІЯНУ

Каманда ангельскага траўлера "Луіза", які вядзе лоўлю селядцоў у Паўночнай Атлантыцы, паціралі рукі ад задавальненьня, назіраючы, як з глыбінь паднімаецца паўнюткая сетка. Якое ж зьдзіўленьне было ў матросаў, калі наўзамен рыбы ў сетцы заблішчэў велізарны грузавік. Матросы пасьпелі ўбачыць, што ён зусім навюткі. Пакуль экіпаж перажываў убачанае, грузавік, прадраўшы сетку, зьнік у віры. Як змагла апынуцца аўтамашына ў 500-х кіламетрах ад берага, пакуль што загадка, бо на аб'яву аб знаходцы, якую матросы далі па радыё, ніхто не адгукнуўся.

ІЛЬВЫ ЗУСІМ АЗЬВЯРЭЛІ

Рэдкі для дзікай прыроды інцыдэнт адбыўся нядаўна ў індыйскім біялагічным парку "Нандан Канан". Ні з таго ні з сяго група ільвоў накінулася на маладую ільвіцу і ў момант яе зьела.

Заолагі парку сцьвярджаюць, што і раней былі сьмяротныя схопкі паміж ільвамі. Але выпадак, калі "цар зьвяроў" зьеў свайго суродзіча, зафіксаваны ўпершыню.

МНІШКІ СУПРАЦЬ ПАСТЫРАЎ

У спаборніцтве накшталт "Клуба вясёлых і знаходлівых", праведзеным берлінскай тэлестудыяй RTL паміж евангелісцкімі пастарамі і каталіцкімі мнішкамі з ордэна "Дочкі Езуса", апошнія не пакінулі шанцаў сваім сапернікам, бліскуча разгуляўшы пародыю на ансамбль "BEATLES".

ПАЛІЦЫЯНТЫ-ЙОГІ

Часы па вывучэньню сістэмы йогі ў якасьці абавязковага прадмета распачалі вывучаць у школе па падрыхтоўцы паліцэйскіх у індыйскім горадзе Хайдарабад.

На думку выкладчыкаў, рэгулярныя заняткі па вывучэньню методык старажытных мудрацоў, а таксама ўрокі медытацыі дапамогуць замацаваць маральна-псіхалагічныя якасьці будучых ахоўнікаў парадку.

(з.д.)

«У ІЗРАІЛІ Я НЕ АДЧУВАЎ СЯБЕ ЧУЖЫНЦАМ»

Кастусь Пашкевіч колькі год таму скончыў Гарадзенскі палітэхнічны тэхнікум па спецыяльнасьці тэхнік-будаўнік. Працаваў на савецкіх новабудоўлях брыгадзірам, майстрам, прарабам. Незадаволіўшыся ўмовамі працы, заробкам, спачатку ад'ехаў да Польшчы. Адтуль разам з некалькімі сябрамі-палякамі завербаваўся да адной будаўнічай ізраільскай фірмы. На каталіцкія каляды гасьцяваў у бацькоў у Горадні. Менавіта падчас пабыўкі Кастуся на радзіме і адбылася наша сустрэча.

- Я пажадаў заможна жыць, мець грошы і шмат чаго іншага. Таму, калі працаваў на тартаку ў Гайнаўцы на Беласточчыне, уважліва сачыў за аб'явамі па найму працоўнай сілы. Не адразу ўсё было гладка. Спрабаваў сябе ў Фінляндыі на цэлюлозным прадпрыемстве, потым быў на лесапавале ў Нарвегіі, дзе абсякаў сукі. Як бачыш, праца была, а пажаданага заробку - кот наплакаў. Ізраіль стаў чацьвёртай замежнай краінай, дзе я шукаў заможнага жыцьця.

- І атрымалася?

- Так, на зямлі абяцанай знайшлося шмат добрай працы для мяне, беларуса-шчасьцешукальніка.

- Калі гэтая праца не сакрэт, то, калі ласка, падрабязней?

- Які тут сакрэт. Працую ў сарака кіламетрах ад Іерусаліма. Прафесіі будаўніка не здрадзіў. Брыгадай з шасьці чалавек узводзім шчытавыя дамкі для перасяленцаў-габрэяў. Наша праца крыху рызыкоўная, бо часам пастрэльваюць бавікі з непрымірымай палестынскай апазіцыі. А калі сьвішчуць кулі, то, як кажуць, "не до жиру, быть бы живу".

- Кастусь, ты працаваў на нашых будоўлях, зараз працуеш за мяжою. Ці параўнальна гэта?

- Ніякага параўнаньня не можа быць. Тут - адны прастоі. Там - інтэнсіўная, высокатэхналагічная праца. Напрыклад, пачатак працы а сёмай гадзіне раніцы. З гадзіны працы - дзесяць хвілін перапынак. Летам, калі занадта горача, працуем з шасьці да адзінаццаці раніцы. Потым - перапынак аж да 16 гадзін і зноўку праца да 20 гадзін вечара. Абеды, жыльлё, рабочая вопратка за кошт працадаўцы. І гэта фактычна ўся сацыяльная абарона. Калі хварэеш, то як кажуць, за свой кошт. Адпачынак, а бяруць яго ў Ізраілі па жаданьню не болей як на 10-12 дзён, таксама за свой кошт. Гэтае правіла адзінае як для эмігрантаў-рабочых, так і для тубыльцаў.

- Няўжо не існуе аніякіх абмежаваньняў для прыезджых?

- Існуюць. Часам у нечым западозрыць вайсковы патруль. Тады ён проста вас абшукае ў мэтах перасьцярогі. Можа нават і затрымаць для высьвятленьня вашай асобы. Праўда, робіцца гэта тактоўна. Мяне асабіста затрымлівалі ўжо неаднойчы і заўжды потым прасілі прабачэньня.

- Як ставяцца да рабочых-эмігрантаў грамадзяне Ізраіля?

- Праблемаў няма, бо большасьць грамадзян зямлі абяцанай - гэта выхадцы з былога СССР. Яны валодаюць "великим и могучим", распытваюць, шукаюць землякоў.

У мяне былі сустрэчы з гарадзенскімі габрэямі, якія жывуць на гістарычнай радзіме па дзесяць і болей год. Бываў у іх сем'ях. О, гэта былі цудоўныя сустрэчы з фуршэтам, песьнямі, успамінамі. Не, на зямлі абяцанай я не быў чужынцам. Таму, прыехаўшы дадому, фактычна не распакоўваў свае дарожныя валізкі. Прывёз падарункі родным і зноў зьбіраюся ў дарогу.

Запісаў Г.АСТРОЎСКІ.



ДАСЬЛЕДАВАНЬНІ

Сяргей Хмара

УСПАМІНЫ ПРА ГРАМАДУ

(Друкуецца на мове арыгінала.)

Сяргей Хмара (сапраўднае прозьвішча Сіняк; 1905-1992) - постаць легендарная ў гісторыі нацыянална-вызвольнага руху ў Заходняй Беларусі. Ахвярна змагаючыся за правы беларускага народа, ён больш дзесяці гадоў праседзеў у польскіх, савецкіх і нямецкіх турмах. Апынуўшыся ў 1944 годзе на эміграцыі, С.Хмара становіцца правадыром адной з трох плыняў беларускай эміграцыі. Шмат бруду выліла на яго камуністычная прапаганда ды й у эміграцыйнай пэрыёдыцы хапала самых розных небыліцаў пра Хмару. Для разуменьня значэньня гэтай асобы ў змаганьні Беларускага народу за сваю дзяржаўную незалежнасьць, могуць дапамагчы ягоныя ўспаміны, якія друкаваліся ў выдаванай ім жа ў Таронта газэце "Беларускі голас". Сёньня мы прапануем нашым чытачам успаміны Хмары пра Грамаду, надрукаваныя ў "Б.Г." у N 364, верасень 1991; калядны 1991/92; 339-340, кастрычнік-лістапад 1987 г.

I. Як мы пачыналі Грамаду.

Таму што я быў сьцісла зьвязаны з Вільняй і часта туды патайком даяжджаў, дык нашая ваколіца апынулася першая з правінцыі, якая заклала Гурток Грамады на Зах. Беларусі паза горадам Вільняй. Сяброўскія Білеты (легітымацыя) гэтага Гуртка пачыналіся лічбай 135 (нумар майго Сяброўскага Білету), што на амаль што 120 тысяч сяброў - нешта кажа. Гэта быў першы Сяброўскі Білет паза горадам Вільняй, дзе аснаваўся наш кіраўнічы Цэнтар на чале з пасламі, Цэнтральным Сакратарыятам і Гарадзкім Гуртком.

На покліч закладаньня вясковых Гурткоў Грамады ўзьнялася гэткая хваля, што ня мы арганізатары з Казлоўшчыны шукалі вёсак, каб зарганізаваць новы Гурток, а людзі прысылалі хадакоў, каб хутчэй да іх ехалі дапамагчы закласьці "Грамаду". Арганізатарам быў я і ўпрост разрываўся, каб пасьпець усюды. Былі дні, што мы пасьпелі закладаць па 4, а нават 5 Гурткоў дзенна. І гэта пры сталых перашкодах паліцыі. Польскі Закон галасіў, што дзеля правядзеньня Сходу трэба мець дазвол Староства, падаючы туды пісаную заяву, не пазьней тыдня перад датай Сходу, з падачай імя адказнога за Сход. Нашы першыя спробы атрымаць дазвол, паза пару выпадкамі, не ўдаліся (давалі дазвол толькі на "ціхія" вёскі). Тады мы ўхітрыліся рабіць напралом. Восьжа напрыклад падавалі заяву аб правядзеньні Сходаў на 4 ці нават 5 вёсак аднаго дня праз кожныя 2 гадзіны. Заявы аб тэрмінах Сходаў пасылалі 10 дзён перад Сходам па Пошце, а таму што яна працавала марудна, дык пакуль заява прыйдзе да Староства праходзіла 3-4 дні і столькі ж з паваротам з Забаронай, ды з Пошты ў Казлоўшчыне на вёску, якая паштароў ня мела, дык звыкла не пасьпявала да тэрміну і мы свае Сходы праводзілі. Калі Староства зпахапілася, мы ўжо мелі не адзін Гурток "лягальна" закладзены. Тады Староства пачала пасылаць нам Забароны пры дапамозе Коннай Паліцыі (ад Казлоўшчыны да Слоніма 30 кілямэтраў, а да некаторых вёсак і да 50-ці). Але мы іх і тутака абхітрывалі. Паліцыя прыяжджала ў першую вёску, дзе напрыклад вызначаны Сход на 8 гадзіну раніцы і чакае мяне як арганізатара і адказнага за Сход, каб дАручыць за подпісам Забарону Сходу, а мы тымчасам едзем да наступнай вёскі, дзе вызначаны Сход на 10-ую гадзіну і там хутка яго праводзім, а паліцыя чакае мяне якую гадзіну на першым мейсцы. Калі яны пераканаюцца, прэць да наступнай вёскі, зразумела з апазьненьнем,бо там мы ўжо Гурток на Сходзе ахворміл. Прычым мы выбіралі вёскі, да якіх дарога была даўжэйшай і пакуль паліцыянты скакалі па ёй на сваіх конях, сяляне праводзілі нас нацякмі сьцежкамі праз балоты, рэчкі, лес, што скарачала дарогу часам на палову. Нам давалі коней, праўда звычайна бяз сёдлаў, і мы сьцежкамі зьяўляліся дзе зусім нечакана для паліцыі. Вось уласьне аб гэтых нашых хітрыках, абвінавачваючы мяне ў Віленскім Цэнтральным Працэсе Грамады і скардзіўся ў сваёй абвінавачальнай прамове Пракурор, што падхапіла Польская прэса Вільні, цытуючы словы Пракурора аба мне, што вось гэта "лятаючы Рыцар Грамады, за якім ня здольвала ўгнацца Конная Паліцыя"...

Адным словам ня гледзячы на забароны на амаль 2/3 Сходаў, мы вось гэткім спосабам патрапілі іх правесьці і Гурткі закласьці ахвіцыяльна. Тады, каб нейк пазбавіцца мяне, Староства пайшло на звычайную правакацыю. Мяне раптам выклікаюць да Слоніму на Ракруцкую Спэцыяльную Камісыю, якая мае праверыць мае маўляў няясныя даты нараджэньня. Калі я зьявіўся да гэтай Камісыі (аказваецца спэцыяльна скліканай у маёй справе), там як яе сябра сядзеў сярод пару лекараў і пан Стараста! Лекарам казана акрэсьліваць мой узрост па зубах. Лекары аднак збаяліся змахляваць і прызнаць (нібы па зубах), што я старэйшы на год - гэта значыць не з 1905-га году, але з 1904 і Камісыя пастанавіла мяне пад арыштам выслаць да Вайсковай Спэцыяльнай Камісыі ў Берасьцейскай цьвярдыні.

Павезьлі мяне этапамі з канвоем да Берасьця. Там пасадзілі у Вайсковую турму і пасьля некага тыдня выклікалі на Камісыю. Лекар-Вайсковец ужо ў зубы не заглядаў, але правёўшы агульны агляд цела, чую кажа: "Годны!", і на бок да пісара-сяржанта: "Да артылеры". Тады я толькі спахапіўся, што гэта і Ракруцкая Камісыя і мяне ўжо забралі як ракрута. Восьжа звараючаюся да гэтага лекара і кажу: "Але ж я глухі! У мяне перабіта ў вусе плонка (вушная перапонка)". Зьдзіўлены лекар залаваўся: "Я ж бадаў". Але такі ўзяў свае прыладзі і пачаў дасьледваць вуха. Зразумела, сьцвердзіў. Мне асьведчылі, што я звольнены ад Вайсковай службы з літарай "ф" і буду адпраўлены (зноў этапамі пад канвоем) да хаты.

Яшчэ праз тыдзень я быў у хаце! Паруганая ў сувязі з маім арыштам на тры тыдні праца па арганізацыі - эднавілася і да канца году ў нас было ўжо 32 Гуртка з лікам больш чым 3 тысячы сяброў Грамады. Што да вуха. Скалечыла мяне Дэфэнзыва, б'ючы перабіла вушную плонку пры адным з арыштаў за закладзіны "нелегальных" Беларускіх Школаў пад фірмай Таварыства Беларускай Школы ў 1925 годзе...

Чаму ў нашай ваколіцы (Ўсход ад ракі Шчары) гэтак бурна разгарнулася Грамада? Таму што гэта быў абшар нашай былой БНР-партызанкі. У кожнай амаль вёсцы былі даўнейшыя партызаны. Мы заўсягды мелі паміж сабой сувязі і яшчэ адное: у нашым навакольлі пачынаючы ад Шундроў і аканчваючы аж па Беліцу, паза Дзятлаўскімі Зьміёўцамі, Нарбутавічамі гміны: Казлоўшчынская, Раготная, Дзераўная, Ліпічанская Пушча і Дзятлаўская, а нават частка Моўчадзкай (Баранавіцкага павету) ня было ячэяк Камуністычнай Партыі, якая моцна аселася на Захад ад Шчары. І таму, калі ў нас ужо было дзесяткі Гурткоў Грамады, там яшчэ амаль аніводнага, бо КПЗБ выдала на пачатку загад: Камуністам не ўступаць да Грамады, а толькі "супрацоўнічаць", ды папіхаць на рэвалюцыйныя цесі. Толькі ў другой палове году, калі пабачылі што Грамада ўзрастае упрост лявінай, далі загад Камуністам ўваходзіць да Грамады, але ня ліквідаваць сваіх ячэяк, як стыхійна рабілі некаторыя вясковыя Камуністычныя ячэйкі, уступаючы да Грамады, бо лічылі, што ім нялягальныя непатрэбная, калі можна змагацца за вызваленьне ў лягальных рамках Грамады.

Устанаўленьне Грамады ў вёсках нагул лічылі ўстанаўленьнем свае Беларускае ўлады. Да нашага Раённага Камітэту Грамады ў Казлоўшчыне напрыклад, зьяўляліся дэлегацыі з вёсак з асьведчаньнем, што яны пастанавілі больш не плаціць падаткаў панскай уладзе, а сваёй г.зн.Грамадзе. Каштавала нам ня мала, каб пераканаць сялян, што мы толькі Партыя, а не Дзяржаўная арганізацыя і плаціць пакуль што трэба Польскай уладзе. Наагул разумелі Грамаду не як нейкую партыю, але як "Беларусь". "Яны пайшлі ў Беларусь",- казалі сяляне на грамадоўскія вёскі. Вясковыя самачынныя Сходы ў пратаколах, дасыланых да нас пастанаўлялі прыкладам: што ў сябры мае ўступаць чалавек з кожнай хаты сяла, або напрыклад гэткая гісторыя. Зьяўляецца да нас у Камітэт сярэдніх год жанчына. Кажа: ўдава з пяцёра дзецьмі, і вось Камітэт Гуртка Грамады адмовіўся яе прыняць у сябры, бо яна і так у нічым не дапаможа ў працы Грамадзе. А як жа я застануся сама з малымі дзецьмі, калі ў нас з каждае хаты належаць? Чаму мяне крыўдзяць? Аказваецца аб што ходзіць: Калі кажа Грамада перабярэ ўладу ад паноў і пачнуць дзяліць панскую зямлю, дык маім дзецям не дастанецца, бо ад нас ніхто не ў Грамадзе. Як пераканаць, што гэта ня так - не ўдалося. Мусялі пісаць наказ Гуртку, каб яе такі прынялі да Гуртка! Або зьяўляецца вясковы курч-крамнік. Яго ня прынялі да Гуртка, бо лічаць яго як уласьніка вясковай крамкі, за зьдзёршчыка людзей. Ён вось гатоў скласьці на Грамаду 500 злотых ахвяры і просіць такі прыняць да Грамады сябрам, ды будзе дапамагаць Гуртку. Мы аднак павярнулі апэляцыю з паваротам да Агульнага Сходу Грамадоўцаў тэй вёскі. Сход пастанавіў адмовіць сяброўства.

Часамі на Сходах, якія праводзіў, даходзіла да нябязьпекі ўжыцьця зброі і ахвяраў. На адным Сходзе, дзе сабралося якіх 3 соткі сялян, па прамовах і выбарах, сябры як звычайна, устаўшы запеялі наш Грамадоўскі гімн "Ад веку мы спалі". Былі, як звычайна, двух паліцманаў з карабінамі. Раптам пачулі крыкі: "Зьняць шапкі, паляч'ё! Гімн сьпяваюць!" Некалькі чалавек кінулася да перапалоханых паліцманаў, наставіўшы на народ стрэльбы. Трэ было не абы якую высілку, каб суцішыць натоўп, выясьняючы людзям, што паліцыянты пры зброі не зьнімаюць шапкі падчас гімнаў, а толькі стаяць на "Зважай!" Натоўп суцішыўся. Аднавілі пеяньне гімну, а паліцыянты выцягнуліся на Зважай! Пасьля гэтага, на Сходы прысылалі пасіленыя атрады паліцыі ад 4-ох да 6-ці паліцманаў. Часта конных, аж са Слоніму. Нарэшце вызначана ў Слоніме Павятовы Зьезд Грамады. Сабралося больш тысячы чалавек на вуліцах (каля 400 толькі з нашага раёну Грамады). Будынак Кіна, дзе меў адбыцца Зьезд, засталі зачынены і наклеяна па Польску на дзьвярах: Зьезд забаронены. Людзі ня вераць і не разыходзяцца. На вуліцах натоўпы. Грамадоўцаў з Чамяроў ля Слоніму, якім даручана арганізацыя Зьезду - няма. Людзі абураныя. Шукаюць інфармацыі, нармальна, зьвяртацца да мяне з нашай ваколіцы як да Раённага Сакратара і арганізатара каля мяне і маіх: натоўпы. Мы ня ведаем нічога і ходаемся нешта даведацца. На вуліцах зьяўляюцца паліцыйныя патрулі і загадваюць групам разыйсціся і разьехацца. Нарэшце зьяўляецца сябра з Чамяроў і зачытвае тэлеграму нашых пасло: Зьезд у апошнюю мінуту забаронены. Што рабіць? Частка настае рабіць Веча на Рынку гораду і прыняць госьці пратэст процiў раптоўнай забароны Зьезду. Людзі не разыходзяцца. Вуліца каля Кіна запруджаная натоўпам. Раптам атрад Паліцыі і жандармэры. Прабіваецца праз натоўп да мяне. Мне асьведчваюць, што я "затрыманы" за арганізацыю забурэньня і маюць мяне забраць да Каманды Паліцыі. Народ з крыкамі ідзе за маімі арыштавальнікамі і скупчаецца масава перад Камандай з крыкамі: "Звольніць сябру! Звольніць арыштаванага Сакратара!" Спроба разагнаць натоўп не ўдаецца. Наадварот, наплывае больш. Вуліца запруджаная пратэстуючымі. Тады да мяне зварачваецца Павятовы Камандант Паліцыі з "выясьненьнямі", што Зьезд забаронены Ваяводай, ды просіць разтлумачыць гэтае на вуліцы, ды прасіць, каб спакойна разыйшліся.

Выпусьцілі пад гучнае "Гурра!" сабраных. Я падняўшыся на некую падстаўленую скрынку і выясьніў, што мне сказалі ў Камандзе аб забароне Зьезду, запрапанаваўшы тутжа прыняць пратэст процiў забароны і варочацца да хаты. Наша група, нешта каля 100 вазоў, выцягнулася доўгай лініяй на прадмесьці Слоніма, як ужо вечарэла і дзьвінулася па шашы пад сьпеў нашых Грамадоўскіх песьняў, у тым ліку і маёй. "Годзе, мы доўга цярпелі, доўга хадзілі ў Ярме"...

На заканчэньне: калі Грамаду абвесьцілі нелегальнай і пачалі ўночы арыштаваньні, да нас на ліквідацыю прыехала паза мяйсцовай, паліцыя і са Слоніма і швадрон Баранавіцкіх Вуланаў на конях. Баяліся ў нашым кутку збройнага супраціву (нешта дайшло да іх аб нашых нарадах: бараніцца). Вязьлі мяне і маіх сяброў у каралеўскай асысьце: два паліцманы са мной на санях, а навокал 6 Вуланаў конна. Гэтак і з маімі сябрамі. Гэтак кончылася нашая Грамадоўская эпапея!

II. Антон Луцкевіч і Грамада

Ці Антон Луцкевіч быў адным з галоўных кіраўнікоў БСР Грамады на Заходняй Беларусі? Напэўна! Хоць ахвіцыяльна ён і ня быў сябрам Грамады, а гэта проста таму, каб не застацца арыштаваным падчас ліквідацыі Грамады Палякамі, аб чым прарочылі з самага пачатку нашыя Польскія прыяцелі, як Санатар Выслоух і іншыя. Каля я даяжджаў да Вільні на адумысныя нарады Кіраўніцтва Грамады, мяне звычайна выклікалі аднаго з нізавых арганізацыяў, дзякуючы таму, што я ўславіўся як адзін з найлепшых арганізатараў вясковых Гурткоў Грамады. Звычайна на гэтых нарадах паза Пасламі і Гэн Сакратаром М.Бурсэвічам, знаходзіўся і Антон Луцкевіч. Гаварыў рэдка і звычайна высоўваючы канкрэтныя прапазыцыі. Нікалі ня клікалі Макоўскага (другога Сакратара), бо як казалі мне ён быў зьвязаны з Камуністамі. Найбольш запомнілася вузкая нарада з нагоды правядзеньня мною прапановы Грамадоўскай Арганізацыі нашага раёну. Між іншым я быў адзіным Раённым Сакратаром Грамады, які абхапляў Казлоўшчыну, Рагаценскую і Дзераўную гміны Слонімшчыны, бо, ў Статуце былі толькі Гмінныя і Павятовыя Камітэты, а ў нас адбыўся гэткі бурлівы рост Грамады, што запатрэбіўся Камітэт, ў якім я быў арганізатарам, на ўсе гміны, дзе я езьдзіў, бо Павятовага Камітэту ў Слоніме яшчэ ня было і па той бок Слоніма, дзе даволі многа было загадана да Грамады ня йсьці.

Калі нам прывезьлі з Польскага Клюбу Грамады асобным пасыльным папярэджаньне (перададзенае Санатарам Выслаухам), што Палякі шыкуюцца да ліквідацыі Грамады і што мы павінны падгатоўваць на мяйсцох заступчыя арганізацыі, мы сьпешна склікалі сваю нараду актывістаў, якія абурана выслаўляліся, што пакорна паддацца ліквідацыі Грамады ня можна, мы мусім збройна супраціўіцца і падняць паўстаньне, навязваючы да тае даўнейшае пагалоскі правакацыйна пушчанай Камуністамі, што калі Зах.Беларусь паўстане збройна, дык Савецкая Беларусь абвесьціцца Незалежнай і дапаможа нам зброяй, каб злучыцца разам у Беларускую Дзяржаву асобна ад СССР. Тут жа выпрацавалі кароткі плян Паўстаньня. Перанясьці нашымі Паўстанцкімі атрадамі Чыгуначных шляхоў на Вільню (Ганцавічы, Баранавічы, Масты), а Віленскае Кіраўніцтва мае правесьці агалашэньне аддзяленьня Заходняй Беларусі ад Польшчы, а калі Савецкая Беларусь агалосіць сваю Незалежнасьць (у што верылі) і кіне збройную дапамогу, мы абвесьцім далучэньне Заходняй Беларусі да Незалежнай Беларусі. Мяне сьпешна дэлегавана з гэтай прапановай у Вільню. Сьпешна склікана нараду, на ёй былі толькі 5 Пасло Грамады, Антон Луцкевіч, Максім Бурсэвіч і Фабіян Акінчыц. Мяне падтрымаў толькі Пасол Валошын. Сымон Рак-Міхайлоўскі нешта сказаў, што трэба падумаць аб "супраціве" пры ліквідацыі. І тады адазваўся А.Луцкевіч. Ён сказаў коратка: "А хто нам дапаможа?" і вылажыў, што Савецкі Саюз гэтага ня зробіць і паўстаньне захлябнецца ў крыві. Мы страцім свой нацыянальны актыў і яшчэ больш паглыбім паняволеньне. Добра,- сказаў ён,- што мы даведаліся аб гэтых настроях і таму сьпешна трэба павядоміць глушэйшы куты, што сёньня ўсякі збройны супраціў пойдзе нам на шкоду. Трэба ўжо загаддзя шыкаваць другія пазыцыі, каб не быць захопленымі зьнячэўку. Мне загадана заразжа ехаць назад і забавязана суцішыць у нашым куце паўстанцкія настроі. Чаму ў нас?

(Працяг у наступным нумары).



праграма тэлеперадач

ПАНЯДЗЕЛАК, 16.01

БЕЛАРУСКАЕ ТЭЛЕБАЧАННЕ

17.10 Тэлебачанне — школе. Побыт вясковых жыхароў Беларусі ў XVIII—X!X стагоддзях 17.30 Мультфільмы 18.00 Навіны 18.10 На добры лад 18.20 Урокі Наталлі Наважылавай 19.00 Навіны (Бі-бі-сі) 19.20 Шоу-прагноз 19.25 Праспект 19.55 Кінанарыс 20.10 Дамавічок 20.15 Люстэрка Сі-эн-эн 20.35 Калыханка 21.00 Навіны 21.40 "Вертыкаль". Пошта Прэзідэнта 22.00 Спартыўны тэлекур'ер 22.20 Кліп-канцэрт 22.30 Фрыстайл. Чэмпіянат Беларусі 22.50 Мультфільмы 23.10 Навіны 23.30 Пад купалам Сусвету

КАНАЛ "АСТАНКІНА"

16.20 "Элен і хлопцы" 16.45 Свет сёння 16.55 Ва ўсіх на вуснах 17.05 Хакей. ЦСКА — СКА (САНКТ-ПЕЦЯРБУРГ) 20.00 Час 20.30 Надвор'е 20.40 Сустрэча з А. Салжаніцыным 21.00 "І шчаслівая сумным лёсам..." Э. Урусава 21.45 Гол 22.15 "Дзе, скажыце нам, Айчыны бацькі..." Да 200-годдзя з дня нараджэння А. Грыбаедава 23.00 Навіны 23.10 Відэамікс 23.35 Аўта-шоу 23.50 Прэс-экспрэс

КАНАЛ "РАСІЯ"

14.00 Тэніс. Чэмпіянат Аўстраліі 15.05 Там-там навіны 15.20 Свята кожны дзень 15.30 Мульці-пульці 15.55 Кліп-антракт 16.00, 19.00, 22.00 Весткі 16.05 Новая лінія 16.50 Казкі для бацькоў 17.20 Рэпартажы з месцаў 17.30 Выратаванне 911 18.25 Вуснамі дзіцяці 19.25 Падрабязнасці 19.35 "Крадзеж у адзін мільён долараў", м/ф 20.40 Рэпарцёр 21.00 Без рэтушы 22.30 Рака часу 22.40 Аўтаімгненне 22.50 "Рускі транзіт", м/ф, с. 4 23.50 Экзотыка

САНКТ-ПЕЦЯРБУРГ

13.00 Тэст 13.30 "Мануэла", м/ф (Італія) 14.20 Мультфільм 14.30, 18.30, 21.30 Інфарм ТБ 14.45, 17.45, 19.05 Музычны момант 14.50 Фільм-канцэрт 15.15 "Сафі", мульт 16.20 Чароўная лінія 16.35 "Каціныя радасці", т/ф 16.55 Цыркавое прадстаўленне 17.50 Крыжыкі-нулікі 18.50 Спорт, спорт, спорт... 19.10 Вялікі фестываль 19.25 "Мануэла", м/ф (Італія) 20.20 "Морыс Бежар. Парадокс". Муз. фільм (Францыя) 21.00 "Жывапісу майстар па сваёй гамне", т/ф 21.10 Тэлемагазін 21.15 Тэлеслужба бяспекі 21.45 Спартыўныя навіны 22.00 Ваш стыль 22.10 "Навагодняе свята", м/ф (Італія), с. 1

ПОЛЬШЧА - 1

07 00 Кава ці гарбата? 09 00 ''Мода на поспех''. Серыял вытв. ЗША. 09 30 Музычная праграма для дзяцей. 09 45 Гімнастыка. 09 50 Мультфільм. 10 00 Навіны. 10 10 Мама і я. 10 25 Дашкольнікі дома. 10 50 Пагаворым аб дзецях. 11 05 ''Доктар Квін''. Серыял вытв. ЗША. 11 55 Музычная праграма. 12 00 Прыемнае з карысным. 12 30 Тэлежурнал. 13 00 Навіны. 13 10 Аграбізнес. 13 15 Адукацыйнае тэлебачанне. 13 15 Сельскагаспадарчая праграма. 13 40 Сталінізм па-польскі. 13 55 Дакументальны фільм. 14 50 Полымем і мячом. 15 05 Паляўнічыяза таямніцамі. 15 15 Энцыклапедыя другой сусветнай вайны. 15 35 Тайная гісторыя СССР. 15 50 Праграма на вечар. 16 00 Музычная праграма. 16 30 Для моладзі. 17 00 ''Мода на поспех''. Серыял вытв. ЗША. 17 35 Тэлетурнір. 18 00 Тэлеэкспрэс. 18 20 Публіцыстычная праграма. 19 10 Серыял вытва. Англіі. 19 40 Юбілейная праграма. 20 00 Вечарынка. 20 30 Навіны. 21 10 Тэлетэатр. 22 05 Інтэрв'ю месяца. 22 45 Пульс дня. 23 05 Публіцыстычная праграма. 23 10 Тыдзень прэзідэнта. 23 20 Мініяцюры. 23 25 Тэлежурнал. 00 00 Навіны. 00 20 ''Кей Ларго''. Фільм вытв. ЗША. 02 05 Музычная прпграма.

ПОЛЬШЧА - 2

08 00 Панарама. 08 10 Дэнамінацыя. 08 15 Спартыўная праграма. 08 20 Ранішні госць. 08 30 Англійская мова. 08 40 Музычныя навіны. 09 00 Мясцовая праграма. 09 30 Камедыйны серыял. 10 00 Свет жанчын. 10 30 Дакументальны серіал. 11 00 Мультсерыял. 11 30 Тэлетурнір. 11 55 Музычная праграма. 13 00 Дакументальны серіал. 13 50 Кракаўскія легенды. 14 00 Панарама. 14 20 ''Чараўнік з вуліцы Вязаў''. Серыял вытв. ЗША. 15 10 Музычны журнал. 15 55 Праграма на вечар. 16 00 Мультфільм. 16 30 Сем дзён польскага спорта. 17 00 Апетыт на здароўе. 17 30 Галерэя артыстаў. 18 00 Дакументальны фільм. 19 00 Панарама. 19 10 Мясцовая праграма. 20 00 Тэлетурнір. 20 35 Праграма для дзяцей. 21 30 Рэпартаж. 22 00 Панарама. 22 35 ''Прыпынак Аляска''. Серыял вытв. ЗША. 23 20 Куды ідзе тэлебачанне. 00 00 Заклік на дапамогу. 00 35 Спартыўная студыя. 01 00 Панарама. 01 05 Дакументальны фільм.

АЎТОРАК, 17.01

БЕЛАРУСКАЕ ТЭЛЕБАЧАННЕ

8.00 "Рамансы". Фільм-канцэрт 8.20 Люстэрка Сі-эн-эн 8.35 Фільм-канцэрт 9.00 Тэлебачанне — школе. Побыт вясковых жыхароў Беларусі ў XVIII — XIX стагоддзях 9.20 "Павуціна", м/ф (Італія), с. 3 10.10 Мультфільмы 11.05 "Поезд са станцыі дзяцінства", м/ф 13.15 "Планета людзей" 13.35 Тэлеклуб "Гаў-гаў" 14.20 "Агонь у жылах крэменю", тэлеспектакль 15.40 "Браты Ермаловічы", д/ф 16.35 Тэлебачанне — школе. Цёзка і яе творчасць 16.55 "Жалезная прынцэса". Фільм-казка 18.00 Навіны 18.10 Кінанарыс 18.20 Зімовыя сны старога парка 18.40 "Трывога" 19.00 Навіны (Бі-бі-сі) 19.20 Шоу-прагноз 19.25 "Тэма для аргана". Муз. фільм 19.35 Студыя "Эксклюзіў" 19.40 Дамавічок 19.45 "Маё каханне, мой смутак" 20.15 Люстэрка Сі-эн-эн 20.35 Калыханка 21.00 Навіны 21.40 Студыя "Палітыка" 21.55 Кліп-канцэрт 22.05 "Павуціна", м/ф (Італія), с. 4 22.55 Эканамікст 23.10 Навіны 23.30 Пад купалам Сусвету

КАНАЛ "АСТАНКІНА"

5.30 Раніца 7.50, 8.50, 9.50, 14.50, 15.50, 17.50, 22.50 Навіны 8.00 "Топа Джыджыа" 8.25 "Дзікая Роза" 9.00 Амерыка з М. Таратутам 9.30 Сёння. Дзень нараджэння імама Махдзі 14.00 Дзверы ў малы бізнес 14.20 Справа і права 14.30 Хроніка дзелавога жыцця 14.40 Культура і бізнес 15.00 Дамісолька 15.30 Чароўны свет, ці Сінема 16.00 Джэм 16.20 "Элен і хлопцы" 16.50 Свет сёння 17.00 Спецыяльная брыгада 17.30 У гэтыя дні 50 гадоў таму 17.45, 20.30 Надвор'е 18.00 Гадзіна пік 18.30 "Дзікая Роза" 18.55 Мы. Аўтарская праграма У. Познера 19.40 Добрай ночы, малышы! 20.00 Час 20.40 З першых рук 20.50 Залаты шлягер 21.35 "Паслухай, Феліні...", м/ф 23.05 Замак мастацтваў 23.50 Прэс-экспрэс

КАНАЛ "РАСІЯ"

6.00, 7.00, 11.00, 13.00, 16.00, 19.00, 22.00 Весткі 6.05 Зоркі гавораць 6.10 Рытміка 6.25 Між іншым 6.55 Рака часу 7.25 Тэлегазета 7.30 Час дзелавых людзей 8.00 Навіны Эй-бі-сі 8.25 Дэпеша 8.55 "Пад чорнай маскай", м/ф (Венгрыя) 10.25 Гандлёвы дом 10.40 Сялянскае пытанне 13.20 Дзелавая Расія 14.00 Тэніс. Чэмпіянат Аўстраліі 15.05 Там-там навіны 15.20 Свята кожны дзень 15.30 "Асабліва сакрэтная місія", м/ф (Аўстралія), с. 2 16.05 Новая лінія 16.45 Нафта Комі: прагнозы і асцярогі 16.55 Гаспадар 17.25 Кінаафіша 17.40 "Мая вайна", д/ф 18.10 L-клуб 19.25 Падрабязнасці 19.40 "Амерыканскі сябар", м/ф (ФРГ — Францыя) 22.30 Аўтаімгненне 22.40 "Рускі транзіт", м/ф, с. 5 23.40 Вечар у стылі рэтра. С. Рагожын

САНКТ-ПЕЦЯРБУРГ

12.00, 14.30, 18.30, 21.30 Інфарм ТБ 12.10 Мультфільмы 12.30, 14.45, 17.50, 19.05 Музычны момант 12.35 "Нямецкая хваля" 13.00 Хуткая дапамога 13.30 "Мануэла", м/ф (Італія) 14.20 "Туман з Лондана", мульт 14.50 "Тэатр мадэмуазель Клерон". Тэлеспектакль 16.40 Чароўная лінія 17.00 Мультфільмы 17.20 Паласатая музыка 17.35 Там, дзе жыве Павуціныч 17.55 Па ўсёй Расіі 18.50 Спорт, спорт, спорт... 19.10 Вялікі фестываль 19.25 "Мануэла", м/ф (Італія) 20.15 "Свет мастацтва" 20.50 Мультфільмы 21.10 Тэлемагазін 21.15 Тэлеслужба бяспекі 21.45 Спартыўныя навіны 22.00 Ваш стыль 22.10 "Навагодняе свята", м/ф (Італія), с. 2

ПОЛЬШЧА - 1

07 00 Кава ці гарбата? 09 00 ''Першыя пацалункі''. Серыял вытв. Францыі. 09 30 Колеры. 09 55 Праграма для дзяцей. 10 00 Навіны. 10 10 Мама і я. 10 25 Дашкольнікі дома. 10 50 Пагаворым пра дзяцей. 10 55 Англійская мова для дзяцей. 11 00 Серыял вытв. ЗША. 11 45 Музычная праграма. 12 00 Рынак працы. 12 20 Запрашэнне да стала. 12 30 Тэлежурнал. 12 50 Сто гадоў. 13 00 Навіны. 13 10 Аграбізнес. 13 15 Адукацыйнае тэлебачанне. 13 15 Сельскагаспадарчая праграма. 13 40 Камп'ютэрная школа. 13 55 Лік матэматыкі. 14 10 Вялікія адкрыцці ў навуцы і тэхніцы. 14 25 Дакументальны фільм. 14 40 Камні з той і не з той зямлі. 14 55 Кніга цудаў тэхнікі. 15 10 Кухня. 15 25 Джойсцік. 15 45 У свеце навукі. 15 50 Праграма дня. 16 00 Музычная праграма. 16 30 Для моладзі. 17 00 ''Першыя пацалункі''. Серыял вытв. Францыі. 18 00 Тэлеэкспрэс. 18 25 Арыя са смехам. 18 45 Аўтаманія. 19 05 Мультсерыял. 19 30 Сенсацыі XX стагоддзя. 20 00 Вечарынка. 20 30 Навіны. 21 10 ''Я супраць''. Фільм вытв. Польшчы. 22 40 Пульс дня. 23 10 Сеймограф. 23 20 Людзі, улада, грошы. 00 20 Дакументальны фільм. 00 50 Экскурсія па Варшаве. 01 20 Начное пільнаванне без бутылкі. 02 20 Музычная праграма.

ПОЛЬШЧА - 2

08 00 Панарама. 08 10 Спорт. 08 20 Ранішні госць. 08 30 Англійская мова. 08 40 Музычныя навіны. 09 00 Мясцовая праграма. 09 30 ''Як ёсць''. Серыял вытв. Польшчы. 10 00 Свет жанчын. 10 30 Дакументальны серыял. 11 00 Фільм для дзяцей. 11 30 Тэлетурнір. 11 55 Шанц на поспех.. 12 45 Партрэт Я. Гайаса. 13 40 Мой маленькі свет. 14 00 Панарама. 14 20 ''Забароненае каханне''. Серыял вытв. Іспаніі. 15 10 Тэлежурнал. 15 55 Прывітанне. 16 00 Фільм для дзяцей. 16 30 Спартыўная студыя. 17 00 Агляд кінахронік. 17 30 Тэлежурнал. 18 00 Тэлежурнал. 18 10 Нашы грошы. 18 40 Каталіцкая праграма. 19 00 Панарама. 19 10 Мясцовая праграма. 20 00 Тэлетурнір. 20 35 Мультсерыял. 21 00 Пытанні аб Польшчы. 21 50 Спартыўная праграма. 22 00 Панарама. 22 30 Экалагічная праграма. 22 40 Рэпарцёры другой праграмы прадстаўляюць... 23 05 ''Тры колера''. Фільм вытв. Польшчы. 00 40 Парыж - Варшава. 01 00 Панарама. 01 05 ''Як вылякаваць боль сэрца''. Фільм вытв. Галанды.

СЕРАДА, 18.01

БЕЛАРУСКАЕ ТЭЛЕБАЧАННЕ

8.00 Фільм-канцэрт 8.15 Люстэрка Сі-эн-эн 8.30 "Маё каханне, мой смутак" 9.00 Тэлебачанне — школе. Цётка і яе творчасць 9.20 Эканамікст 9.30 "Павуціна", м/ф, с. 4 10.20 Урокі Наталлі Наважылавай 10.50 Мультфільмы 11.15 "Мой свет" 11.50 "Д'Артаньян і тры мушкецёры", м/ф, с. 1 13.15 Я. Паплаўскі. Канцэрт для хору "Мой ціхі дом" 13.50 "Танцпляцоўка", м/ф 15.15 Відзьма-нявідзьма 16.20 "Васількі за Бугам", д/ф 16.40 Мультфільмы 17.00 "Працяг", д/ф 17.30 Сталіца 18.00 Навіны 18.10 "Крок". Закон і ты. Прамая лінія 19.00 Навіны (Бі-бі-сі) 19.20 Шоу-прагноз 19.25 Мультфільм 19.40 Дамавічок 19.45 "Маё каханне, мой смутак" 20.15 Люстэрка Сі-эн-эн 20.35 Калыханка 21.00 Навіны 21.40 Студыя "Палітыка" 21.55 Кліп-канцэрт 22.05 "Павуціна", м/ф (Італія), с. 5 22.55 Пад купалам Сусвету 23.10 Навіны 23.30 "Крок". Студыя "Формула"

КАНАЛ "АСТАНКІНА"

5.30 Раніца 7.50, 8.50, 9.50, 14.50, 15.50, 17.50, 22.50 Навіны 8.00 "Топа Джыджыа" 8.25 "Дзікая Роза" 9.00 Клуб падарожнікаў 14.00 Вытворчасць: буйны план 14.20 Грошы і шчасце 14.30 Хроніка дзелавога жыцця 14.40 Агенцтва "Шанц" 15.00 Паглядзі, паслухай 15.20 Адказы 16.00 Цін-тонік 16.20 "Элен і хлопцы" 16.50 Свет сёння 17.00 Кампанія "Мір" 17.40, 20.30 Надвор'е ~~17.45~~ "Хто ёсць хто. XX стагоддзе". Ф. Кафка ~~18.00~~ Гадзіна пік 18.30 "Дзікая Роза" 18.55 Фабрыка мары 19.40 Добрай ночы, малышы! 20.00 Час 20.40 Маналог 20.50 Канцэрт, прысвечаны ўручэнню прэміі "Трыумф" 21.40 Вестуны 22.10 Баскетбол. Мужчыны. ЦСКА — "Паок" (Грэцыя) 23.05 У свеце джаза 23.25 Новыя жыхары 23.50 Прэс-экспрэс

КАНАЛ "РАСІЯ"

